УДК 811.161.3:367.335

# Да праблемы вывучэння аднасастаўных выказнікавых канструкцый: безасабовыя і інфінітыўныя сказы

Савіцкая І.У.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

*Анатацыя:*

У артыкуле разглядаецца спецыфіка функцыянавання безасабовых і інфінітыўных аднасастаўных сказаў у сучаснай беларускай мове. Апісваюцца спосабы выражэння ў іх галоўнага члена, асаблівасці іх семантыкі, структуры і ўжывання.

У сучаснай беларускай мове шырока выкарыстоўваюцца аднасастаўныя канструкцыі з галоўным членам выказнікам, сярод якіх найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца безасабовыя сказы.

**Безасабовымі** называюцца такія аднасастаўныя сказы, у якіх галоўны член абазначае працэс, дзеянне або стан незалежна ад дзеючай асобы: *Светла ў полі, светла на душы* (Д. Бічэль-Загнетава). *Няма на свеце нічога больш неабходнага чалавеку, чымсьці сонца* (В. Казько).

У такіх сказах няма дзейніка, а выказнік паказвае на дзеянне, якое ўтвараецца само сабою, безадносна да ўтваральніка дзеяння. У адрозненне ад іншых відаў выказнікавых аднасастаўных сказаў (пэўна-асабовых, няпэўна-асабовых, абагульнена-асабовых), у безасабовых сказах дзейнік не толькі не абазначаны, але нават не падразумяваецца і не ўзнаўляецца з кантэксту. Так, напрыклад, у сказах *На душы ў мяне неспакойна* або *Бацьку нездаровіцца* ёсць толькі ўскоснае ўказанне на асобу, якая знаходзіцца ў пэўным псіхічным або фізічным стане. Пры такой форме галоўнага члена (*неспакойна, нездаровіцца*) не можа быць актыўна дзеючай асобы ў форме назоўнага склону.

Своеасаблівасць безасабовых сказаў ствараецца ўзаемадзеяннем семантычных і граматычных фактараў і наглядна раскрываецца пры іх супастаўленні з сінанімічнымі двухсастаўнымі канструкцыямі. Безасабовыя сказы дапамагаюць выразіць найбольш тонка і дакладна такога роду дзеянні і стан, якія адбываюцца стыхійна, самі па сабе, а ўнутры нас – мімаволі. Так, зусім не раўназначныя безасабовыя сказы *Мне не спіцца; Мне сумна* і сінанімічныя двухсастаўныя *Я не сплю*; *Я сумую,* паколькі двухсастаўныя сказы ўказваюць на ўдзел асабістай волі ў праяўленні таго ці іншага дзеяння, у іх сцвярджаецца сувязь дзеяння з яго ўтваральнікам. Безасасбовыя ж сказы абазначаюць дзеянне або стан, якія зусім не залежаць ад асабістай волі чалавека.

Адсюль агульнай рысай безасабовых сказаў з'яўляецца тое, што галоўны член іх не выражае ўяўлення аб аднясенні дзеяння, прыкметы або стану, аб якіх гаворыцца ў сказе, да прадмета як яго ўтваральніка.

Некаторыя даследчыкі ўказваюць, што дзеясловы тыпу *цямнее, прыпарвае, пахне, світае* з'яўляюцца формай 3-яй асобы (параўнайце з асабовымі дзеясловамі тыпу *працуе, чытае, малюе, даследуе).* Аднак такая форма дзеясловаў у безасабовых сказах не суадносіцца з формамі 1-ай і 2-ой асобы, як у асабовых дзеясловах (параўнайце: *працую, чытаю, малюю, даследую; працуеш, чытаеш, малюеш, даследуеш*), таму значэння асобы не мае. Такім чынам, у форме выказніка не выражана значэнне асобы і няма ўказання на яго ў кантэксце. У маўленні ж выбар двухсастаўнага ці аднасастаўнага сказа вызначаецца камунікатыўнай задачай: у першым выпадку выдзяляецца прадмет і дзеянне, у другім – падкрэсліваецца стыхійнасць дзеяння.

Безасабовыя канструкцыі вельмі разнастайныя паводле семантыкі. Так, у тэксце яны выконваюць наступныя сэнсавыя функцыі:

1. Выражаюць стан прыроды або навакольнага свету: *Парна зранку* (Якуб Колас). *А навокал так бялютка-бела* (Д. Бічэль-Загнетава).

2. Выражаюць дзеянні невядомай або міфічнай сілы: *I вось урэшце Івану Іванавічу пашанцавала* (М. Лынькоў).

3. Выражаюць стан чалавека (фізічны або псіхічны): *Тахкае і баліць у галаве* (К. Чорны). *Апейку было лёгка, радасна* (І. Мележ).

4. Ужываюцца для выражэння мадальных адносін: *Ганне нізашто не хацелася паказваць перад свёкрам і перад свякрухаю свой боль* (І. Мележ).

5. Выражаюць наяўнасць або адсутнасць, дастатковасць або недастатковасць чаго-небудзь або каго-небудзь: *Людзей тут было мала* (В. Карамазаў). *На самым краі высокага абрыву соснаў больш* (Я. Брыль).

Спосабы выражэння галоўнага члена ў безасабовых сказах самыя разнастайныя. Так, выказнік у іх можа быць выражаны:

1. Безасабовым зваротным або незваротным дзеясловам тыпу *світае, змяркаецца, вечарэе, халадае* і да т. п. у спалучэнні з інфінітывам або без яго: *Ужо **змерклася*** (М. Лынькоў). Раптоўна ***захаладала*** (І. Шамякін).

2. Асабовым дзеясловам у безасабовым значэнні: *У Апейкі **грымела** ў скронях* (І. Мележ). ***Пахне** сасной, зямлёю і мокрай глінай* (І. Пташнікаў).

3. Прыслоўямі стану тыпу *хораша, добра, прыемна, весела, ціха, трэба, неабходна, варта* і да т. п.: ***Хораша** ў полі зімою* (М. Лынькоў). ***Позна** ўжо. **Ціха, цёпла*** (І. Навуменка).

4. Дзеепрыметнікам залежнага стану ў форме прошлага часу: *На безымянным кургане ім **суджана** вянком апасці* (М. Танк).

5. Дзеясловам *быць* у форме прошлага або будучага часу з адмоўем *не* або без яго: *Яўхіма **не было*** (І. Мележ). ***Было** ўжо за поўнач* (М. Лынькоў).

6. Адмоўным словам *няма*: *Нідзе нікога* ***няма*** (Якуб Колас). *Ні лясоў, ні крыжоў цяпер* ***няма*** (Я. Скрыган).

7. Фразеалагізмам: *Потым* ***як ветрам змяло*** *і самога Скавараду* (І. Навуменка). *Паўліка* ***нібы ветрам знясло*** *з зэдліка* (І. Шамякін).

Паводле структуры безасабовы сказы могуць быць развітымі і неразвітымі: *У хаце было зусім светла* (І. Грамовіч). *Пачынае шарэць* (І. Пташнікаў). Часцей яны ўжываюцца як самастойныя простыя сінтаксічныя адзінкі, аднак могуць з'яўляюцца часткамі складаных канструкцый розных тыпаў: ***Зусім пачынала віднець****, а на полі разгуляўся радасны вецер* (К. Чорны).

Семантычная і структурная разнастайнасць безасабовых сказаў садзейнічае выкарыстанню іх ва ўсіх сферах грамадскай дзейнасці, што абслугоўваюцца рознымі стылямі сучаснай беларускай мовы. Асабліва шырока яны ўжываюцца ў гутарковым стылі і мове мастацкай літаратуры.

**Інфінітыўнымі** называюцца такія аднасастаўныя выказнікавыя сказы, галоўны член якіх выражаны незалежным інфінітывам: *Не наглядзецца на воблакі ў бязветраны дзень* (І. Грамовіч).

Інфінітыўныя сказы блізкія да безасабовых, паколькі выражаюць дзеянне, безадноснае да асобы. Гэты факт дае падставы некаторым навукоўцам разглядаць іх як разнавіднасць безасабовых сказаў; у школьных падручніках яны таксама не выдзяляюцца ў асобны тып аднасастаўных сказаў, а ўключаюцца ў групу безасабовых сказаў з простым дзеяслоўным выказнікам. Тым не менш большасць вучоных, а таксама аўтары Граматыкі беларускай мовы, дапаможнікаў і даведнікаў па беларускай мове для ВНУ такія канструкцыі разглядаюць як самастойны тып аднасастаўных сказаў.

Інфінітыўныя сказы маюць сваю спецыфіку, што і дазваляе, на наш погляд, вылучыць іх у асобную групу аднасастаўных сказаў. Ад безасабовых канструкцый іх адрознівае наступнае:

1. У інфінітыўных сказах інфінітыў незалежны, гэта значыць, ён не залежыць ні ад якога слова (безасабовага дзеяслова ці прыслоўя), а наадварот, усе словы падпарадкаваны яму ў сэнсавых і граматычных адносінах: *Глухому дзве абедні не служаць* (Прыказка). У безасабовых жа сказах інфінітыў граматычна падначалены безасабоваму дзеслову або прэдыкатыўнаму прыслоўю. Напрыклад, у сказе *Добра жыць і тварыць пад радзімай зарой* (П. Панчанка) інфінітывы *жыць* і *тварыць* залежаць ад прыслоўя *добра.*

2. У безасабовых сказах значэнне мадальнасці выражаецца лексічна, гэта значыць, словамі, да якіх прымыкае інфінітыў (безасабовым дзеясловам, безасабова-прэдыкатыўным словам), а ў інфінітыўных – самой формай інфінітыва і інтанацыяй.

3. Інфінітыўныя сказы адрозніваюцца ад безасабовых агульным значэннем. Калі большасць безасабовых сказаў абазначае дзеянне, якое ўзнікае стыхійна, незалежна ад ўтваральніка, то ў інфінітыўных сказах дзеючая асоба, як правіла, пабуджаецца да актыўнага дзеяння, адзначаецца пажаданасць або непажаданасць дзеяння, яго непазбежнасць і г. д.

Паводле семантыкі сказы з незалежным інфінітывам у ролі выказніка вельмі разнастайныя. У сучаснай беларускай мове ў залежнасці ад мадальных значэнняў выдзяляецца некалькі іх відаў, у якіх выражаецца:

1) неабходнасць дзеяння: *Вам спраўдзіць нашы спадзяванні і замяніць сваіх бацькоў* (М. Хведаровіч);

2) аб’ектыўная непазбежнасць, абавязковасць або прадрашучасць наступлення пэўнай падзеі: *Дзеда ўжо не стрымаць* (І. Мележ);

3) магчымасць або немагчымасць дзеяння: *Міколу сёння не пазнаць* (Якуб Колас);

4) пажаданасць або непажаданасць дзеяння: *Мне пагаварыць бы / З бацькам, з маці…* (М. Танк);

5) пабуджэнне да дзеяння: *Сёння ж адбыць!* (І. Шамякін);

6) пытанне пра магчымасць або неабходнасць дзеяння, намер высветліць штосьці: *А навошта абражаць чалавека?* (І. Шамякін).

Як бачым, інфінітыўныя сказы характарызуюцца лаканічнасцю, выразнасцю, эмацыянальнасцю, экспрэсіўнасцю; часта яны бываюць клічнымі або пытальнымі, могуць мець форму рытарычнана пытання: *А як не ўспомніць цёплым, добрым словам выкладчыка старога роднай мовы!* (П. Прыходзька). У сувязі з гэтым яны звычайна выкарыстоўваюцца ў гутарковым і мастацкім стылях. Канструкцыі ж са значэннем катэгарычнага загаду часта ўжываюцца ў афіцыйна-справавым стылі (у афіцыйных пастановах, загадах, указах і г. д.).

## Літаратура


1. Граматыка беларускай мовы: у 2 т. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства; рэдкал.: К.К. Атраховіч (Крапіва) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1962–1966. – Т. 2: Сінтаксіс. – 1966. – 756 с.

2. Рамза, Т.Р. Аб семантыцы безасабовых сказаў / Т.Р. Рамза // Веснік БДУ. Серыя 4. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – № 2. – С. 31–34.

3. Рамза, Т.Р. Безасабовыя сказы / Т.Р. Рамза. – Мн.: НВК «Тэхналогія», 1998. – 70 с.

4. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы / Н.М. Чалюк. – Мн.: ТэтраСістэмс, 2004. – 204 с.